View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
PolotskSU



**УДК 021.4(476.5)**

# УТВАРЭННЕ І ДЗЕЙНАСЦЬ ДЗЯРЖАЎНАЙ ІНСПЕКЦЫІ ПА АХОВЕ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ Ў 1991–2001 гг.

***К.В. АНДРЭЙЧЫК***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***

*Разглядаецца механізм функцыянавання Дзяржаўнай інспекцыі па ахове гісторыка-культурнай спадчыны ў 1991 – 2001 гг. Утварэнне органа было абумоўлена спробай рацыяналізаваць адміністрацыйна-арганізацыйную структуру сістэмы дзяржаўнага кіравання ў дачыненні да ахоўнай справы. На інспекцыю ўскладалася ажыццяўленне дзяржаўнай палітыкі ў галіне ўліку і аховы гісторыка-культурных каштоўнасцей. На заканадаўчым узроўні была замацавана самастойнасць і падначаленнасць органа Савету Міністраў. Інспекцыя ажыццяўляла падрыхтоўку праектаў заканадаўчых актаў, міжнародную дзейнасць праз заключэнне пагадненняў, навукова-метадычнае забеспячэнне, каардынацыю дзейнасці Беларускай рэспубліканскай Навукова-метадычнай рады па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны.*

***Ключавыя словы:*** *органы ўлады, заканадаўства, дзяржаўнае рэгуляванне, гісторыка-культурныя каштоўнасці, дзяржаўная інспекцыя па ахове гісторыка-культурнай спадчыны.*

**Уводзіны.** З набыццём суверэнітэта айчынная сістэма аховы гісторыка-культурнай спадчыны была падвергнута структурным і арганізацыйным змяненням. Гэты працэс актуалізаваўся з прыняццем уласнага заканадаўства, а дакладней – Закона Рэспублікі Беларусь “Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны”, які быў прыняты 11 снежня 1992 г. Пачынаючы з 31 лістапада 1984 г. у структуры кіравання культуры і аховы помнікаў пры Міністэрстве культуры БССР дзейнічала дзяржаўная інспекцыя па ахове помнікаў гісторыі і культуры, але выпрабаванне часам вымагала шукаць больш эфектыўныя метады кіравання ахоўнай галіной. Выйсцем бачылася прамая падначаленасць найвышэйшаму органу выканаўчай улады, які ажыццяўляў кіраўніцтва сістэмай падпарадкаваных яму рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання і іншых дзяржаўных устаноў – Савету Міністраў. Да таго ж, надзённасць наспеўшых праблем у справе ўліку і аховы гісторыка-культурнай спадчыны краіны падтрабавала выдзялення самастойнага кампітэнтнага органа.

**Асноўная частка.** У адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь “Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны” Пастановай Савета Міністраў 11.12.1992 г. № 745 была створана Дзяржаўная інспекцыя па ахове гісторыка-культурнай спадчыны (далей – ДзІнАС) [1; 2, с. 132].

Дзяржаўная інспекцыя Рэспублікі Беларусь па ахове гісторыка-культурнай спадчыны з’яўлялася спецыялізаваным дзяржаўным органам па ажыццяўленні дзяржаўнай палітыкі ў галіне ўліку і аховы гісторыка-культурнай спадчыны. Асноўнай мэтай новаўтворанага органа было зберажэнне гісторыка-культурных каштоўнасцей, іх асяроддзя і ўмоў існавання, недапушчэнне страты адметных вартасцей каштоўнасцей, іх навукова не абгрунтаваных змен, кантроль за практычным выкарыстаннем помнікаў даўніны, вывучэнне гісторыка-культурнай спадчыны, выяўленне і ўлік каштоўнасцей, вяртанне ў Рэспубліку Беларусь каштоўнасцей Беларусі, якія апынуліся па-за яе межамі, кантроль за выкананнем патрабаванняў заканадаўства аб ахове гісторыка-архітэктурнай спадчыны. У вырашэнні пералічаных пытанняў ДзІнАС падпарадкоўвалася Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь. Прадстаўнікі орагана ўваходзілі ў склад апарата культуры аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама, аддзелаў культуры райвыканкамаў і гарвыканкамаў.

Прыярытэтнай задачай ДзІнАС было ажыццяўленне дзяржаўнай палітыкі Рэспублікі Беларусь у галіне ўліку і аховы гісторыка-культурнай спадчыны, падрыхтоўка прапаноў і абранне курса на пабудову эфектыўных метадаў рашэння сістэмных праблем ахоўнай галіны. Не менш значнымі былі задачы па выпрацоўцы механізму вяртання рухомых каштоўнасцей беларускага народа, якія апынуліся па-за межамі краіны. Актуальным заставалася пытанне стварэння спрыяльных умоў для папулярызацыі і вывучэння гісторыка-культурнай спадчыны, актывізацыя гэтага працэсу. Сярод першасных мерапрыемстваў вызначалася метадычная арганізацыя сістэмы ўліку каштоўнасцей і кіраўніцтва яе дзейнасцю. Патрабавала ўвагі выпрацоўка падыходаў кіраўніцтва дзейнасцю Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай рады па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны і правядзенне навукова-метадалагічнай работы ў галіне ўліку, аховы, зберажэння, аднаўлення, выкарыстання, памнажэння і вяртання гісторыка-культурнай спадчыны. Адпаведна прынятаму заканадаўству патрабвалася рэгламентацыя і нарматыўна-метадычнае забеспячэнне дзейнасці юрыдычных і фізічных асоб, якая датычылася пытанняў дагляду, рамонту, натурных даследаванняў, кансервацыі, рэстаўрацыі, рэгенерацыі, аднаўлення, прыстасавання, дапаўнення, раскрыцця, выяўлення, вяртання каштоўнасцей. Не менш значным было ажыццяўленне метадычна-абгрунтаванай дзейнасці па падбору і класіфікацыі спецыялістаў, якія могуць быць дапушчаны да правядзення адказных работ, што непасрэдна ўздзейнічаюць на адметныя вартасці каштоўнасцей.

PolotskSU



З’яўленне новай краіны на палітычнай карце свету патрабавала ўключэння яе ў правядзенне актыўнай знешняй палітыцы ў сферы міжнароднага супрацоўніцтва па справе ўліку і аховы гісторыка-культурнай спадчыны [3, л. 45].

У сваёй дзейнасці ДзІнАС павінна была кіравацца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь і Палажэннем. З гэтай нагоды 30 красавіка 1993 г. Пастановай Савета Міністраў № 265 было зацверждана Палажэнне, якое вызначала структуру, функцыі, кампетэнцыю органа. Дакументам былі выдзелены штатныя адзінкі для камплектавання апарату органа аховы, сродкі на яго ўтрыманне і іншыя выдаткі. Канкрэтныя службы і падраздяленні ДзІнАС павінны былі кіравацца палажэннямі аб Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь, упраўленнях культуры аблвыканкамаў і Мінгарвыканкама, аддзелах культуры райвыканкамаў і гарвыканкамаў у залежнасці ад адміністрацыйнай падпарадкаванасці. У адпаведнасці з Палажэннем, інспекцыю ўзначальваў старшыня, які прызначаўся Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь. Ён меў аднаго намесніка, які таксама прызначаўся Саветам Міністраў. Старшыня ДзІнАС нёс персанальную адказнасць за выкананне ўскладзеных на орган задач і функцый, а таксама ўстанаўліваў ступень адказнасці намесніка старшыні, упаўнаважаных прадстаўнікоў інспекцыі на месцах, супрацоўнікаў цэнтральнага апарату. 11 снежня 1992 г. Пастановай Урада за № 746 старшынёй ДзІнАС быў прызначаны Д.С. Бубноўскі. Перазацвердажанне старшыні, які адпаведна Палажэнню аб ДзІнАС павінен адначасова быць намеснікам Міністра культуры, адбылося 11 чэрвеня 1993 г., і было замацавана пастановай Савета Міністраў № 381 ад 16 чэрвеня 1993 г., а таксама Загадам Міністра культуры № 112-к. [4, л. 23.].

Структура цэнтральнага апарата ДзІнАС складалася з наступных адзінак: старшыня ДзІнАС, намеснік старшыні, аддзел па справах матэрыяльных нерухомых каштоўнасцей, аддзел па справах матэрыяльных рухомых каштоўнасцей, аддзел па справах духоўных каштоўнасцей, аддзел па справах каштоўнасцей народа Беларусі, што знаходзяцца па-за яе межамі. Структура інспекцыі прадугледжвала наяўнасць Упраўленняў па абласцях: Брэскай, Віцебскай, Гомельскай, Гродзенскай, Магілеўскай, Мінскай і асобна – гораду Мінску, агульны аддзел, фінансава-эканамічны аддзел [5, л. 75]. Пастановай Савета Міністраў была ўстаноўлена штатная структура работнікаў ДзІнАС, без уліку персаналу па абслугоўванні і ахове будынкаў, і налічвала 17 адзінак супрацоўнікаў. Прычым з Дзяржаўнай інспекцыі па ахове помнікаў гісторыі і культуры, што існавала раней пры Міністэрстве культуры, былі пераведзены ў штат 5 адзінак. Заяўленыя 17 адзінак паасобна значыліся ва ўпраўленнях культуры аблвыканкамаў, Мінскага гарвыканкама і аддзелаў Кобрынскага, Пінскага, Полацкага, Мазырскага, Слонімскага, Навагрудскага, Нясвіжскага, Бабруйскага, Мсціслаўскага райвыканкамаў і гарвыканкамаў [3, л. 65].

Дзяржаўная інспекцыя ў межах сваёй кампетэнцыі выдавала загады, сумесна ці пры ўзаемадзеянні з іншымі міністэрствамі, ведамствамі і камітэтамі, з’яўлялася юрыдычнай асобай, мела права Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь і сваю сімволіку, а таксама права ўдзелу ў размеркаванні сродкаў фонда аховы гісторыка-культурнай спадчыны з рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў [3, л. 79].

Першачарговымі мерапрыемствамі ДзІнАС па развіцці і ўдасканаленні нарматыўнай базы ў галіне гісторыка-культурнай спадчыны былі наступныя: супрацоўнікі інспекцыі разам з адказнымі дзяржаўнымі структурамі ў адпаведнасці з Пастановай Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ад 13 лістапада 1993 г. № 1941–ХП правялі работу па прывядзенні заканадаўчых актаў Рэспублікі Беларусь, а таксама рашэнняў Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь у адпаведнасць з новым законам “Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны”. На перыяд з 1992 па 1994 гг. захоўвалася юрыдычная сіла за былымі пастановамі органаў дзяржаўнай улады, якімі ўжо былі зацверджаны дзяржаўныя спісы помнікаў гісторыі і культуры. Уключаныя ў гэтыя спісы аб’екты да моманту разгляду кожнага з іх Навукова-метадычнай радай па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры ДзІнАС працягвалі лічыцца гісторыка-культурнымі каштоўнасцямі. У гэты час працягвалася работа па ўдакладненні пытанняў аб парадку перамяшчэння рухомых культурных каштоўнасцей. Былі выпрацаваны канцэптуальныя прапановы аб прынцыпах узаемаадносін паміж краінамі, што ўваходзілі раней у былы СССР, у галіне правоў уласнасці на агульныя некалі гісторыка-культурныя каштоўнасці. Гэтыя распрацоўкі сталі асновай праектаў шматбаковых міжурадавых пагадненнняў паміж Урадамі краін СНД па рэстытуцыі каштоўнасцей. Не засталіся па-за ўвагай міжнароднае супрацоўніцтва і падрыхтоўка нарматыўных дакументаў з заходнееўрапейскімі краінамі. Так, у 1992 г. кіраўніцтва ДзІнАС прыняла ўдзел у падрыхтоўцы і падпісанні тэкста міжурадавай дэкларацыі аб супрацоўніцтве ў галіне навукі, культуры, асветы паміж Польшчай і Рэспублікай Беларусь; удзельнічала ў падрыхтоўцы праекта межурадавага пагаднення па гэтым жа пытанні з Германіяй; распрацавала варыянт Пагаднення аб прынцыпах узаемаадносін у галіне гісторыка-культурнай спадчыны з ЗША; прапанавала тэкст Пагаднення паміж урадамі Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі. У 1994 г. у Мінску адбылося першае ўстаноўчае паседжанне сумеснай Беларуска-Польскай кансультацыйнай камісіі па справах гісторыка-культурнай спадчыны, створанай у адпаведнасці з Беларуска-Польскай міжнароднай дэкларацыяй аб супрацоўніцтве ў галіне навукі, культуры і асветы. Створаная камісія атрымала ад урадавых прадстаўнікоў абодвух бакоў (старшыні ДзІнАС і спецяліста ад Урада Польшчы) першае заданне па збору матэрыялаў па аднаўленні гісторыка-культурнай спадчыны Нясвіжа як буйнага культурнага цэнтра Еўропы [3, л. 88].

PolotskSU



Навукова-метадычная дзейнасць інспекцыі была засяроджана на распрацоўцы формы Дзяржаўнага спіса гісторыка-культурных каштоўнасцей, стварэнні Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай рады па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны; афармленні ахоўных абавязацельстваў, зыходна-дазваляльных дакументаў. З прычыны таго, што ў кампетэнцыю ДзІнАС уваходзілі пытанні па аб’ектах рухомай і нерухомай спадчыны, то актуальным было выяўленне і наданне статуса каштоўнасці музейным экспанатам. Так, у 1993 г. вядучым дзяржаўным музеям і бібліятэкам быў разасланы цыркулярны ліст з просьбай даць прапановы па наданні статуса каштоўнасці найбольш адметным адзінкам захавання з фондаў. Таксама апрабіраваліся прынцыпы вызначэння правоў уласнасці на выпадкова выяўленыя каштоўнасці і механізмы выплаты ўзнагарод асобам, якія іх выявілі, устанаўлення памераў кампенсацый, што павінны ўтрымлівацца за неадпаведнае выкарыстанне матэрыяльных нерухомых каштоўнасцей. У супрацоўніцтве з Галоўным упраўленнем па рэстаўрацыі і кансервацыі помнікаў гісторыі і культуры пры Савеце Міністраў Беларусі (з яго навукова-метадычным цэнтрам) былі распрацаваны прадугледжаныя Законам формы ўліковых дакументаў на матэрыяльныя нерухомыя каштоўнасці, таксама формы Дзяржаўнага спіса гісторыка-культурных каштоўнасцей народа Беларусі. Фарміраваўся каталог каштоўнасцей страчаных падчас Другой Сусветнай вайны. У 1993 г. адбыўся Польска-Амерыканскі сімпозіум па праблемах гістарычнага асяроддзя з удзелам краін Прыбалтыкі і Беларусі. У адпаведнасці з пратаколам мемарандума паміж Рэспублікай Беларусь і ЮНЕСКА быў распрацаваны і накіраваны ў Парыж варыянт праекта “Мірскі замак”. ДзІнАС арганізавала і правяла ў жніўні 1993 г. пад эгідай ІКОМОС міжнародную навукова-практычную канферэнцыю “Утопія і рэчаіснасць – праблемы аховы і рэстаўрацыі гісторыка-культурных каштоўнасцей у канцы XX ст.” Старшыня ДзІнАС прыняў удзел у навуковым семінары ІКОМОС у 1995 г. у Берліне адносна пытанняў аховы помнікаў савецкай эпохі [3, л. 88].

ДзІнАС праводзіла планамерную працу па азнаямленні мясцовых выканаўчых органаў улады з прынятым заканадаўствам. Напрыклад, 14 красавіка 1993 г. у Віцебскім аблвыканкаме прайшла метадычная нарада-семінар з удзелам намеснікаў старшынь райвыканкамаў, а таксама кіраўнікоў устаноў, прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый. Загаддзя ў кожны рай(гар)выканкам былі дасланыя ўзоры ахоўных абавязацельстваў, якія інспектары пры мясцовых гаркамах заключалі з уладальнікамі або карыстальнікамі помнікаў. Асабліая ўвага надавалася рэгламентацыі відаў рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ, якія падзяляліся на аднаўленчыя работы, дапаўненне, кансервацыю, прыстасаванне, раскрыццё, рэгенерацыю, рэканструкцыю і рэстаўрацыю [3, л. 90].

Наступным этапам стала ўпарадкаванне штатнай структуры на ўзроўні аблвыканкамаў. Так, пасля распараджэня Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 22 красавіка 1992 г. № 397 і ў адпаведнасці з пастановай Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь “Аб рэарганізыцыі справы аховы гісторыка-культурнай спадчыны” пры аблвыкнкамах пачаўся працэс падбору кадраў. З гэтай нагоды пры Віцебскім абласным савеце народных дэпутатаў на пасаду інспектара па ахове помнікаў 25 лістапада 1992 г. была прызначана Ніна Андрэеўна Сулецкая, якая мела адукацыю гісторыка і раней працавала наменсікам старшыні абласнога таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры. На тэрыторыі Мінскай вобласці ў гэтым жа годзе былі ўведзены 2 адзінкі супрацоўнікаў: у Мінску і Нясвіжы. Апошняя была ўведзена ў жніўні 1993 г. Таксама ў адпаведнасці з Пастановай Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ад 15 мая 1991 г. № 799-XII і распараджэннем Савета Міністраў Беларусі ад 22 красавіка 1992 г. № 397 у штат упраўлення культуры Брэстскага аблвыканкама, Кобрынскага і Пінскага гарвыканкамаў былі ўведзены штатныя адзінкі інспектараў. У 1993 г. Гродзенскім абласным Саветам народных дэпутатаў была ўведзена адзінка інспектара ў штат аддзелў культуры Лідскага, Навагрудскага і Слонімскага гарвыканкамаў [6, с. 5].

На пачатковым этапе работы даволі актыўна праходзіў працэс выдачы зыходна-дазваляльнай дакументацыі, у якой прапісваліся ўмовы работы на аб’ектах. У 1993 г. было выдадзена 38 планавых рэстаўрацыйных заданняў, узгоднена 126 адзінак навукова-праектай дакументацыі, выдадзена 57 ліцэнзій юрыдычным і фізічным асобам на права работ з каштоўнасцямі. У перыяд з 1994 па 1997 гг. – 56 планавых рэстаўрацыйных заданняў, 115 ліцэнзій юрыдычным і фізічным асобам на права работ з каштоўнасцямі.

У 1997 г. орган аховы прайшоў чарговы этап аптымізацыі. Згодна з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, ДзІнАС была ператворана ў Камітэт па ахове гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь. Пазней, у 1998 г., дзяржаўная інспекцыя па ахове гісторыка-культурнай спадчыны была расфарміравана на два камітэты: камітэт па рэстаўрацыі і кансервацыі помнікаў і камітэт па ахове гісторыка-культурнай спадчыны. У 2001 г. была прынята Пастанова Савета Міністраў № 862, згодна якой інспекцыя па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і камітэт па рэстаўрацыі і кансервацыі былі аб’яднаны ў Дэпартамент па ахове гісторыка-культуронай спадчыны і рэстаўрацыі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь [5, с. 133].

**Высновы.** Такім чынам, утварэнне Дзяржаўнай інспекцыі па ахове гісторыка-культурнай спадчыны стала планамерным актам у межах рэалізацыі Закона “Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны”, прынятым у 1992 г. Створаная ў снежні таго ж года ДзІнАС абапіралася ў сваёй дзейнасці на Палажэнне

PolotskSU



аб ДзІнАС, зацверджданае адпаведнай пастановай Савета Міністраў Беларусі ў 1993 г. Згодна з дакументам орган ажыцяўляў падрыхтоўку праектаў заканадаўчых і падзаконных актаў, выдачу юрыдычным і фізічным асобам даведак і пасведчанняў у справе аховы, зберажэння і аднаўлення гісторыка-культурных каштоўнасцей, выдачу інструкцый і метадычных дакументаў, што рэгламентавалі дзейнасць службовых асоб і грамадзян у адносінах да ўліку, аховы гісторыка-культурных каштоўнасцей, ажыцяўляў каардынацыю дзейнасці Беларускай рэспубліканскай Навукова-метадычнай рады па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны, меў магчымасць удзельнічаць ў размеркаванні сродкаў рэспубліканскага і мясцовага бюджэтаў, фарміраваў Банк звестак аб гісторыка-культурнай спадчыне Рэспублікі Беларусь, праводзіў падбор і класіфікацыю спецыялістаў, якія маглі быць дапушчаны да работ, прымаў удзел у падпісанні міжнародных пагадненняў, што датычыліся ахоўнай справы.

ЛІТАРАТУРА

1. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф.7. Воп. 12. Спр. 660.
2. Об охране историко-культурного наследия : Закон Респ. Беларусь от 13 нояб. 1992 г., № 1940-XII [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.belzakon.net. – Дата доступа: 20.01.2019.
3. Несцярчук, Л. М. Ахова гісторыка-культурнай спадчыны Белаурсі. Асноўныя этапы фарміравання, сучасны стан і перспектывы / Л. М. Несцярчук. – Мінск, 2003.
4. НАРБ. – Ф.7. Воп. 12. Спр. 666.
5. НАРБ. – Ф. 968. Воп. 1. Спр. 4049.
6. Андрэйчык, К. В. Захаванне і адраджэнне гісторыка-культурнай спадчыны горада Віцебска ў 1991 – 2001 г. / Андрэйчык К. В. // Науч. тр. Респ. ин-та высш. шк. – 2018. –Ч. 1 – С. 3–9.

*Паступіў 13.03.2019*

## ESTABLISHMENT AND ACTIVITIES OF THE STATE INSPECTORATE FOR THE PROTECTION OF HISTORICAL AND CULTURAL HERITAGE IN 1991 – 2001

***K. ANDREICHYK***

*The article deals with the mechanism of functioning of the state Inspectorate for the protection of historical and cultural heritage in 1991-2001.the formation of the body was due to an attempt to rationalize the administrative and organizational structure of the public administration system in relation to the security business. On inspection implementation of the state policy in the field of accounting, protection, historical and cultural values was added. At the legislative level, the independence of the body and its subordination to the Council of Ministers were fixed. The inspection carried out the preparation of draft legislative acts, carried out international activities through the conclusion of agreements, scientific and methodological support, coordination of the activities of the Belarusian Republican scientific and methodological Council on historical and cultural heritage.*

***Keywords:*** *authorities, legislation, government regulation, historical and cultural values, State Inspectorate for the protection of historical and cultural heritage.*